***У. Ф. Красюк,***
*кандыдат філасофскіх навук*

# ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ ЯК ФАКТАР ЗАХАВАННЯ КУЛЬТУРНАЙ САМАБЫТНАСЦІ

Феномен гістарычнай памяці ў апошні час усё больш прыцягвае ўвагу даследчыкаў. Нягледзячы на даволі шырокае ўжыванне гэтага паняцця, яго змест раскрыты недастаткова грунтоўна. Асаблівасці нашага часу вызначаюць неабходнасць уважліва разглядаць усе акалічнасці культурнага жыцця, каб не аказаліся па-за ўвагай, як цяпер прынята гаварыць, шматлікія выклікі эпохі. Глабалізацыя сусветных працэсаў, медыятызацыя планетарнай прасторы, інтэрнацыяналізацыя міжкультурных зносін, стварэнне мультымедыйнай культуры і многае іншае выклікаюць магутныя інфармацыйныя патокі, якія патэнцыяльна здольны выцясняць краевугольныя камяні культурнай самабытнасці народа. Таму актуальнай з'яўляецца праблема нацыянальнай ідэнтычнасці, захавання нацыянальна-культурнага менталітэту, што дазволіць нацыі як сацыяльна-гістарычнаму ўтварэнню зберагчы сваю цэласнасць, не быць размытай разам са стратай сваёй жыццяздольнасці. Захаванню гістарычнай памяці адводзіцца ў гэтым прыярытэтная роля.

Вызначым некаторыя аспекты, якія спрыяюць інсталяцыі, функцыянаванню і захаванню гістарычнай памяці.

Найперш увагу трэба звярнуць на неабходнасць генерацыі і фарміравання нацыянальна-грамадзянскай свядомасці. Пэўна, цяжка назваць нармальнай з'явай тое, што, згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, наша моладзь яшчэ далёкая ад патрыятычнага стаўлення да сваёй краіны: сёння Беларусь для яе – гэта проста месца пражывання, жыццёвая прастора.

Фарміраванне гістарычнай памяці нацыі з'яўляецца адной з асноўных стратэгій развіцця культуры Беларусі XXI ст. Праца ў гэтым напрамку павінна насіць комплексны характар, ахінаючы ўсю паўнату духоўна-культурнага багацця, створанага народам. Улічваючы цяжкасці з матэрыяльным забеспячэннем захавання культурнай спадчыны, магчымасцей яе папулярызацыі, трэба, зыходзячы з рэалій сённяшняга дня, звярнуць увагу на неабходнасць руплівай працы па тых напрамках, якія складаюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падмурак напрацоўкі пазітываў, што паспрыяюць рашэнню разглядаемага пытання.

Можна вызначыць некаторыя аспекты культуратворчасці і грамадскіх умоў, якія павінны паспрыяць такой рабоце, тым больш, што пошук беларускай перспектывы не пачынаецца з нейкай адвольнай кропкі бягучага часу, а вядзецца з улікам усёй той гістарычнай рэтраспектывы, якая праектуецца ў гістарычную памяць.

Адкрыта зазначым наступнае: «Асноўная праблема сённяшняй Беларусі палягае ў тым, што беларуская культурная традыцыя, уключаючы мову, літаратуру, мастацкую культуру, фактычна не можа працаваць дастаткова эфектыўна на нацыю і дзяржаву»[1]. Гэта вынік прымітыўнага ўхілу ў бок абстрактнага інтэрнацыяналізму, які не меў часам змястоўнага азнаямлення з сапраўдным багаццем культуры суседніх народаў. Таму, калі сёння глабалізацыя як сацыякультурны выклік сучаснай эпохі пашырае свае межы, то паўстае дваістая па змесце сітуацыя: па-першае, неабходна рэальнае засваенне навуковых і культурных набыткаў народаў свету, а па-другое – неабходна зберагчы і развіць у новых умовах сваю нацыянальную культуру. Без гістарычнай памяці гэта немагчыма: пераемнасць традыцый, ідэй культурнай спадчыны будзе нерэалізавана, а пра адраджэнне нацыянальнай культуры і гаворкі не можа быць.

Талерантнасць беларусаў паспрыяе хуткаму засваенню сучасных сусветных навацый, якія наблізяць да перадавых дасягненняў інфармацыйнай цывілізацыі. Адначасова ёсць небяспека абсорбцыі эрзац-культуры не лепшых узораў мас-медыя, аднабокай вестэрнізацыі. Культурны плюралізм можа быць насычаны дэструктыўнымі і крызіснымі элементамі. Таму, каб інтэгратыўныя працэсы не размылі сацыякультурную цэласнасць беларускага этнасу, што не паспрыяе якасці яго жыццяздольнасці, неабходна захоўваць асновы яго самабытнасці, нацыянальна-культурнай адметнасці, прадухіліць пагрозу сацыяльна-этнічнай індыферэнтнасці. Культурная самабытнасць без гістарычнай памяці не існуе – разуменне сваёй тоеснасці адэкватна ўяўленню аб векапомных шляхах, што прайшоў народ.

---

[1] *Уладыкоўская-Канаплянік, Л.* Беларусь XXI стагоддзя : да праблемы стратэгіі нацыянальна-культурнага і духоўнага развіцця / Л. Уладыкоўская-Канаплянік // Беларусь – XXI ст. : нацыянальна-культурнае і духоўнае развіццё : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. Мінск, 10–12 снеж. 2003 г. / ННАЦ імя Ф. Скарыны ; рэдкал.: Л. Уладыкоўская-Канаплянік [і інш.]. – Мінск, 2004. – С. 65–70.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адчуванне сваёй культурнай самабытнасці дапамагае кансалідацыі грамадства. А гэта неабходна ў сітуацыі, калі бярэ разгон дыялог культур, вынікам якога могуць быць і негатыўныя праявы сацыяльнай аморфнасці, страты арыентацый, рэцыдывы адмоўнай поліканфесійнасці, касмапалітызму, духоўнага нігілізму. Сказаць сваё слова, успрыняць пазітыўнае, устанавіць паразуменне дапаможа адчуванне сваёй годнасці, наяўнасць сацыяльных ідэалаў, шанаванне нацыянальных сімвалаў, паглыбленне ведаў аб падзеях нацыянальнай гісторыі, веданне жыццяпісу народных герояў. Такім чынам, магчыма засваенне агульначалавечых каштоўнасцей пры шанаванні нацыянальнай культуры і сваіх традыцыйных каштоўнасцей.

Гістарычная памяць садзейнічае самаідэнтыфікацыі народа; для беларусаў гэта ёсць спосаб самасцвярджэння ў полі міжнацыянальных адносін. Усведамленне прыналежнасці да народа, якому абавязаны жыццёвымі рэсурсамі, неабходнымі для існавання чалавека, надае імпульс пачуццю ўдзячнасці яму, сацыяльнай актыўнасці, адчуванню сваёй тоеснасці ў гэтым мультыкультурным свеце. Адсутнасць гэтага прыводзіць да парушэння сацыяльнага самаадчування, дыскамфорту, культурна-духоўнай індыферэнтнасці.

Цывілізацыйная дынаміка XXI ст. надае сусветнай супольнасці патранаж заходніх стандартаў. Аднак гэта сустракае магутны ціск з боку іншых асяродкаў многапалярнага свету, а біфуркацыйныя працэсы ўносяць дысананс у разуменне магістральных шляхоў зямной цывілізацыі. Наяўнасць нацыянальнага менталітэту дае магчымасць знайсці пункт апоры, не разгубіцца і плённа працаваць на ніве роднай культуры. Гістарычная памяць дазваляе заглянуць у мінулае, знайсці адпаведныя аналогіі, акрэсліць спецыфіку надзённай сітуацыі – нацыянальная ментальнасць мацуецца, развіваецца сваё бачанне быцця, паглыбляецца духоўная сінергія.

Таму гістарычная памяць – гэта не толькі знаёмства з мінулым беларускага народа, гэта комплексны спектр з’яў, які ўключае і сацыяльную дынаміку жыцця народа, яго культурныя набыткі, ментальнасць, самаідэнтыфікацыю, пачуццё сваёй адметнасці і самабытнасці. Сённяшні стан роднай культуры патрабуе вяртання да шырокага ўжытку мовы тытульнай нацыі, якая захоўвае, развівае і зацвярджае глыбінныя вытокі гістарычнай памяці народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ